# Літаратуразнаўства

Л. Д. КОРАНЬ

## АБ НЕКАТОРЫХ АСАБЛІВАСЦЯХ ПСІХАЛАГІЗМУ АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА «ЗНАК БЯДЫ»

Творчасць В. Быкава, як неаднаразова адзначалася ў крытыцы, надзвычай цэласная, паслядоўная, нават сістэмная. Быкаў адметны ўстойлівасцю інтарэсаў і характэрнасцю почырку, у меркаваннях пра яго стыль часта сустракаецца азначэнне «аналітычны». Падобны стыль натуральна выпрацоўвае і нейкія стабільныя прыёмы псіхалагічнага аналізу, якія можна ўзвесці да пэўнай тыпалагічнай агульнасці. Апошнюю мы знойдзем у агульнасці тых твораў сучаснай «ваеннай прозы», у якіх «трывальасць апавядальнай структуры абумоўлена іменна тым, што знешняе ў ёй (падзея, павароты дзеяння) неадрыўнае ад унутранай плыні, у якой раскрываецца псіхалагічная падаплёка падзей, бачных на паверхні. Абодва патокі трывала звязаны адзінствам учынка і ўтвараюць цэласны псіхалагічны комплекс»[1]. Асаблівасць псіхалагізму ў творах такога тыпу заключаецца ў тым, што, *па-першае*, непарыўнасць сувязі пачуццяў з дзеяннямі выключае ўсякую іерархію пры разглядзе гэтых пачаткаў; і *па-другое*, унутраны сюжэт у падобнай прозе аднапланавы: «псіхалагічны стан героя матывуе іменна гэты, адзіны, канкрэтны, але надзвычай важны ў жыцці героя ўчынак»[2].

І сапраўды, у творчасці В. Быкава аднапланавасць такога характару заўсёды была вельмі прыкметнай. Якога б героя з 14-ці быкаўскіх аповесцей, напісаных перад «Знакам бяды», мы ні ўзялі, перад намі заўсёды паўстане псіхалагічна вызначаны ў асноўным і ва ўсім вызначаны маральна тып, які падцвердзіў іменна пэўную сваю сутнасць учынкамі, часта — апошнім вырашальным учынкам. Персанаж у Быкава самараскрываецца пад уздзеяннем абставін; псіхалагічныя ж характарыстыкі ўвесь час абслугоўваюць, суправаджаюць гэты працэс. У канцы аповесці мы дакладна ведаем пра героя галоўнае: маральны ён ці амаральны чалавек. Паўната яго псіхікі, нейкае псіхалагічнае цэлае пры гэтым тэкстуальна не выяўляецца, глыбіня і шматмернасць унутранага свету героя маецца на ўвазе па-за апісанымі падзеямі. Малююцца толькі тыя псіхалагічныя праявы, на якія героя правацыруюць канкрэтныя абставіны. Нам могуць паведамляцца пэўныя матывы, пабуджэнні ўчынкаў, часам нейкія агульныя арыенціры з мінулага героя — яго паходжанне, адзнакі індывідуальнага лёсу і да т. п. Але мы бачым як бы гарызантальны зрэз яго псіхікі. Мы бачым тую работу, якая прарабляецца жыццём над нейкім непасіўным генатыпам, і яе вынікі, заўсёды адназначныя. Інструментарый псіхалагічнага аналізу забяспечвае рэалістычнасць паказу гэтай імклівай і жорстка арыентаванай работы. Псіхалагічная «вертыкаль», генетычны падыход тут прысутнічае толькі як рабочы момант, перыпетыя ў ліку розных жыццёвых уплываў. Тут, у лакальных аповесцях, у тэксце не падаецца і непасрэдна не апісваецца псіхіка як асаблівы свет са сваімі спецыфічнымі заканамернасцямі; тут метафарычна, праз нейкія апорныя звенні ўчынкаў даецца нам разуменне ліній унутранага развіцця герояў як «светаў, бясконца больш шырокіх, чым знешнія праявы дзеючых асоб... і заўсёды далёка не вычарпаных і не пакрытых учынкамі»[3]. У аповесцях Быкава на першым выяўленчым плане якраз толькі тое ў гэтых псіхалагічных светах, што звязана з пэўным учынкам, таму што ўчынак вызначае галоў-

нае для нас у даны момант — маральнае «так» або «не». Думаецца, той факт, што словазлучэнні тыпу «быкаўскі герой», «быкаўская аповесць» распаўсюдзіліся ў якасці своеасаблівых тэрмінаў, нярэдкіх ужо ў размовах пра тыпалагічна роднасную «ваенную прозу», у немалой ступені звязаны і са своеасаблівасцю псіхалагічнага аблічча персанажаў Быкава, якой пісьменнік дасягнуў дзякуючы іменна паслядоўнасці ў правядзенні пазначаных тут мастацкіх абмежаванняў.

Новая аповесць Быкава характэрызуецца, на наш погляд, тымі выяўленчымі кірункамі псіхалагічнага даследвання, якія ў сістэме яго папярэдніх твораў былі залішнімі. Тут трэба зазначыць, што гаварыць пра змены ў псіхалагізме пісьменніка дае нам падставы змена хранатопа, як істотнай узаемасувязі часавых і прасторавых адносін [4], у яго новай аповесці.

Пра хранатоп у Быкава трэба сказаць наступнае. У яго аповесцях, на наш погляд, прысутнічаюць тры рознавіднасці істотнай прасторава-часавай сувязі (час і прастора бяруцца тут у так званым канцэптуальным плане [5]): А-хранатоп, дзе час экстэнсіўны, а прастора інтэнсіўная; В-хранатоп, дзе гэтая залежнасць адваротная; С-хранатоп, дзе і час, і прастора экстэнсіўныя.

Да групы А мы адносім наступныя аповесці: «Здрада» (у рускім перакладзе — «Фронтовая страница»), «Мёртвым не баліць» (у асноўнай частцы), «Сотнікаў», «Дажыць да світання», «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца», «Альпійская балада». Да групы В — сем аповесцей: «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Пастка», «Круглянскі мост», «Праклятая вышыня» (у рускім перакладзе — «Атака с ходу»), «Абеліск», «Яго батальён». Вылучым асноўныя характарыстыкі гэтых груп.

Група А. Сюжэтны рух адбываецца пераважна ў часе. Прастора звужаецца і сплывае, абрываючы час. Абставіны знікаюць, адыграўшы ў сваю чаргу пэўную ролю ў аўтарскай задуме. Асноўная сэнсавая нагрузка раскладваецца па каардынатнай лініі часу. Тут паказальны матыў дарогі, гэта нібы матэрыяльнае выяўленне каардынаты часу, на якой адзначаецца кожная падзея як знешняга, так і ўнутранага жыцця персанажаў. Можна сказаць, што вобраз дарогі ўвасабляе структурны прынцып аповесцей гэтага тыпу.

Група В. Сюжэтны рух адбываецца пераважна ў прасторы. Час не адыгрывае прынцыповай ролі, не мяняе асноўнай расстаноўкі сіл. У аповесцях гэтага тыпу прысутнічаюць праграмныя героі і антыгероі як канструктыўныя моманты самой ідэі (у адрозненне ад аповесцей першага тыпу, дзе несапраўдная пазіцыя, калі яна прад'яўлена, аб'ектыўна не прэтэндуе на сапраўднасць). Спрэчка ідзе як бы на роўных, аргументы і контраргументы рухаюцца цэнтраімкліва да ідэйных поглядаў-пунктаў, фарміруючы з фактаў мастацкай прасторы сваё абгрунтаванне, доказ. Рух падзей канструктыўна палемічны, праз яго нарошчваецца вобразная плоць на зыходныя моманты спрэчкі-сцверджання аўтарам сваёй ідэі.

Вернемся да нашай характарыстыкі быкаўскага псіхалагізму як у пэўным сэнсе аднапланавага, метафарычнага, як заўсёды арыентаванага на канкрэтны ўчынак (які выяўляе маральнасць). Такая ўласцівасць псіхалагічнага аналізу цалкам адпавядае асаблівасцям быкаўскага хранатопа. Іменна тып сувязі прасторы і часу ў мастацкім свеце кожнай аповесці вызначае формы псіхалагізму, а ў аповесцях Быкава гэтая сувязь якраз аднапланавая, г. зн. фармальна, вонкава сюжэтны рух адбываецца альбо «ўглыбіню», альбо «ўшырыню», інтэнсіфікацыя і экстэнсіфікацыя дзеяння ідуць як бы адно за кошт другога, — так дасягаецца чысціня «маральнага эксперымента», асабліва жорсткая, быкаўская логіка развіцця падзей. Поле даследвання Быкава заўсёды дакладна аддзелена ад таго матэрыялу (часавага ці прасторавага), які для доказу дадзенай маральнай максімы другасны і які мог бы толькі зацямніць і абцяжарыць доказ. Ідэя, сюжэт Быкава заўсёды развіваюцца ў экстэнсіўным плане, другі элемент рухае, інтэнсіфіцыруе гэтае развіццё. У такім жа сэнсе, у фармальным, аднапланавы і быкаўскі «метафарычны» псіхалагізм: у аповесцях А-хранатопа псіхалагічнае аблічча герояў праясняецца з развіццём, з усё большай насычанасцю і напружанасцю сюжэтнага часу пад бакавым уздзеяннем «аб'ектыўных», бывае ледзь не «экзістэнцыяльных» абставін; у аповесцях групы В пэўны, заяўлены зусім аднназначна герой дэманструецца рухам падзей, раскрываецца дзякуючы ўласна падзейнай актыўнасці.

У новай аповесці Быкава малюецца ўжо найбольш псіхалагічная «вер-

тыкаль», цэлы свет псіхікі чалавека ў сваім сталым руху. Апошні выраз не выпадковы, тут маецца на ўвазе тая супярэчнасць (самарух), якую называюць коранем усякага руху і жыццёвасці [6]. Характары падаюцца нам у гэтым разе не толькі як функцыі нейкіх глыбінных маральных пастаянных. Дакладней, мы сочым цяпер за героямі з іншага пункту гледжання, і нам непасрэдна адкрываецца тое, што даследчыкі (С. Бачароў) вызначаюць як адносна самастойную плынь душэўнага жыцця, такую, што кожная новая падзея-перажыванне ўключаецца ў працэс, які ідзе ўжо. У «Знаку бяды» да малюнкаў акупацыйнага быту, што складаюць знешні і выразна быкаўскі сюжэт аповесці, дадаецца гістарычны план: бытнасць яшчэ батрацкая галоўных герояў, беларускіх сялян Петрака і Сцепаніды Багацькаў, першыя гады Савецкай улады, першыя калгасы і лікбезы, раскулачванне, перадваенныя часы, — прычым у лёсе герояў усё гэта выяўляецца іменна як «пульсацыя самаруху і жыццёвасці» ў гістарычным патоку жыцця. Калі гаварыць пра спосаб раскрыцця характараў, то мы маем тут той выпадак, калі справа заключаецца кожны раз «не ў знешняй матывіроўцы, а ў глыбіннай плыні ўсяго расказа, у выразным раскрыцці супярэчнасцей унутранага «я» герояў, перамен іх адносін да рэчаіснасці» [7]. Пятрок і Сцепаніда Багацькі — плоць ад плоці народнай маральнасці, але быць такой плоццю вельмі няпроста. Звычайна мы ў ваенных аповесцях маральнасць гэтую ў вялікай ступені як бы прымаем на павер праз нейкія пераканаўчыя апорныя арыенціры; у такіх творах, як «Знак бяды», мы яе бачым непасрэдна як жывы, рэальны феномен у фарміраванні і дзеянні. Пад які б знешні ўціск Пятрок і Сцепаніда не падпадалі, маральнае пачуццё ў іх не знікае. Аднак складаныя гістарычныя сітуацыі і правяраюць у чалавеку галоўнае. Перашкоды правяраюць стабільнасць сутнасных установак і арыентацый чалавека ў дынамічным свеце. Мы называем Петрака і Сцепаніду асобамі гераічнага і трагічнага лёсу, таму што ў гэтым сэнсе іхнія характары дынамічна стабільныя. Адпаведна сярод здраднікаў, «бобікаў» у аповесці аказваюцца і тыя людзі, якія ніколі не мелі «катэгарычнага імператыву» маральнасці, хоць і лічыліся ў свой час «прававернымі».

Звернемся да хранатопа аповесці «Знак бяды». Тут, відаць, і час, і прастора Быкава набываюць экстэнсіўнасць (С-хранатоп); г. зн. сюжэтна дзеянне развіваецца ў шырокай прасторы і ў шырокім гістарычным часе (не блытаць з месцам і часам фабульнага дзеяння, якія якраз не новыя для Быкава). Псіхалагізм С-хранатопа губляе сваю прыкметную прадвызначанасць; кожны пункт псіхалагічнага раду суадносіцца не толькі з адпаведным яму знешнім момантам, але і з папярэднім ходам непасрэдна адлюстраванага душэўнага жыцця [8]. Псіхалагізм робіцца як бы адчувальным аб'ёмным «напаўненнем» апавядальнай структуры. Скарыстаўшы вядомы ў псіхалогіі вобраз [9], можна сказаць, што ў «Знаку бяды» мы бачым унутраны свет герояў як варонку, якая звернута шырокай гарлавінай да свету гістарычнай рэчаіснасці і вузкай да дзеяння — пры выяўленчай роўназначнасці праяўленага і непраяўленага непасрэдна фабульным дзеяннем унутранага зместу асоб; у той час як у былой сістэме аповесцей Быкава унутраны свет герояў падаваўся ў значнай ступені «метафарычна» — у пераважнай накіраванасці да фабульнага дзеяння, да вырашальнага ўчынку. Самая агульная графічная схема быкаўскіх хранатопаў паказвае гэта наглядна, адбіваючы, так сказаць, «профілі» быкаўскага псіхалагізму (гл. рысунак).

У «аб'ектыўнай» прозе ідэю можна выявіць паўнацэнна толькі праз характары, і калі раней Быкаў-мастак імкнуўся ў сваіх аповесцях найперш



вылучыць самае істотнае ва ўнутраным свеце персанажаў, абмяжоўваючы іх непасрэдныя праявы альбо ў прасторы, альбо ў часе, каб сканцэнтраваць такім чынам энергію ідэі, то ў новай аповесці ён імкнецца да асноўных герояў паставіцца прынцыпова «стэрэаскапічна», ён як бы змяшчае ў прасторава-часавай рамцы частку слаба, «натуральна» зараджанага поля, але зараджанага той энергіяй, якую называюць латэнтнай, — «схаванай цеплынёй патрыятызму.»

У нас няма ніякага намеру заключыць, што аповесць «Знак бяды» выпадае з сістэмы быкаўскіх твораў. Тым не менш адносна жанравай формы, напрыклад, трэба заўважыць, што рамкі аповесці для «Знака бяды» не такія арганічныя, як гэта было ў некаторых іншых творах Быкава, дзе форма і змест у сваім дасканалым спалучэнні сапраўды нібы самавыяўляліся. У гэтым плане, думаецца, тыя новыя якасці, якімі ўзбагаціўся псіхалагізм пісьменніка, — здольнасць непасрэдна зафіксіраваць звязанасць цэлых светаў псіхікі і рэчаіснасці — уступаюць у прыкметную супярэчнасць з формай аповесці. Аповесць ідэальна падыходзіць для іншых выпадкаў: тых, калі перад аўтарам стаіць задача «прарэзаць» спалучэнне названых двух светаў у нейкім адным, дамініруючым вострапраблемным напрамку (што мы і бачылі ў Быкава раней). З другога боку, створаныя Быкавым народныя характары ў «Знаку бяды» таксама набылі тую па-сучаснаму эпічную жыццёвасць і веліч, якая падымае герояў у рамках аповесці, так што мы ўспрымаем у ёй у першую чаргу і ў асноўным яе змястоўны, а не цэласна-эстэтычны план.

Пра псіхалагізм жа Быкава можна заключыць наступнае. Мы імкнуліся пазначыць тут некаторыя тыпы прасторава-часавай сувязі ў аповесцях пісьменніка, і такім шляхам выявілі тыя самыя агульныя, устойлівыя ў Быкава падыходы да вырашэння задач псіхалагічнага аналізу, якія абумоўліваюць характэрнасць быкаўскага псіхалагічнага інструментарыя — больш прыватных прыёмаў і сродкаў псіхалагічнага даследвання. На падставе нашых назіранняў, думаецца, можна зазначыць, што апошнім часам у псіхалагізме Быкава на розных узроўнях узмацняюцца эпічныя тэндэнцыі, праяўляецца імкненне даследваць маральныя праблемы, не толькі збіраючы рэчаіснасць у аптычны фокус вакол сітуацыі выбару, але і вобразна пашыраючы погляд, укараняючы крытычную сітуацыю ў шырокае і бачнае гістарычнае поле зроку.

[1] Белая Г. А. Художественный мир современной прозы.— М., 1983, с. 35.
[2] Там жа.
[3] Бочаров С. Г. Психологическое раскрытие характера в русской классической литературе и творчество Горького.— У кн.: Социалистический реализм и классическое наследие. М., 1960, с. 106.
[4] Гл.: Бахтин М. Вопросы литературы и эстетики.— М., 1975, с. 234.
[5] Гл.: Зобов Р. А., Мостепаненко А. М. О типологии пространственно-временных отношений в сфере искусства.— У кн.: Ритм, пространство и время в литературе и искусстве.— Л., 1974.
[6] Гл.: Ленин В. И. Полн. собр. соч., т. 39, с. 124.
[7] Храпченко М. Б. Горизонты художественного образа.— М., 1982, с. 284.
[8] Гл.: Бочаров С. Г. Указ. работа, с. 125.
[9] «Шэрынгтон параўноўвае нашу нервовую сістэму з варонкай, якая звернута шырокай гарлавінай да рэчаіснасці і вузкай — да дзеяння. Свет уліваецца ў чалавека праз шырокую гарлавіну варонкі тысячай поклічаў, прынад, раздражненняў, і толькі мізэрная іх частка ажыццяўляецца і нібы выцякае на паверхню праз вузкую гарлавіну».— Выготский Л. С. Психология искусства.— М., 1968, с. 313.

І. К. ЦІШЧАНКА

## РУСКАЕ ГЕАГРАФІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА І БЕЛАРУСКАЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА

У даследаванні быту і фальклору народаў Расіі вялікую ролю адыграла Рускае Геаграфічнае Таварыства (РГТ), створанае ў 1841 годзе. З гэтага часу пачынаецца арганізаванае, планамернае і інтэнсіўнае вывучэнне беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці. На старонках перыядычных выданняў Таварыства з'явіліся першыя сур'ёзныя публікацыі беларускага фальклору, а таксама навуковыя працы аб вуснай паэзіі беларусаў. Так, у «Записки Русского Географического Общества по Отде-